*УДК [61+615.1](06)(043.2)*
*ББК 5+52.81*
*А 43*
*ISBN 978-985-21-1569-8*


***Франчанка К. В., Юрчанка А. С.***

# НА МЯЖЫ ВЫМІРАННЯ І ЗАБЫЦЦЯ: ЧАМУ ЗНІКАЮЦЬ МОВЫ?

***Навуковы кіраўнік ст. выкл. Носік А. А.***
*Кафедра беларускай і рускай моў*
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт, г. Мінск*

**Актуальнасць.** Працэс знікнення моў з’яўляецца важнай праблемай сучаснай грамадскасці. Глабалізацыя, якая ў шырокім сэнсе азначае ўзнікненне гібрыднай сусветнай культуры і змешванне нацыянальных традыцый, закранае і моўную сферу. У выніку адбываецца сціранне моўных межаў, інтэрнацыяналізацыя моў, пагроза іх вымірання. Кантакты носьбітаў моў, кантакты цэлых культур прыводзяць да непазбежнага ўздзеяння моў адна на адну.

**Мэта:** аналіз глабальнай праблемы знікнення моў; пошукі шляхоў захавання і падтрымкі моў, што знаходзяцца на мяжы вымірання.

**Матэрыялы і метады.** Пры правядзенні даследавання выкарыстоўваўся метад апісальнай статыстыкі; параўнальны аналіз лінгвагеаграфічных дадзеных ЮНЭСКА; аналіз вынікаў перапісу насельніцтва РБ 2019 г.; анкетаванне студэнтаў беларускіх універсітэтаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Шляхам вывучэння акадэмічных публікацый праекта “Мовы пад пагрозай знікнення” з пазіцый антрапалогіі, сацыялогіі і лінвістыкі было выяўлена, што ў групу рызыкі на сённяшні дзень трапілі амаль тры тысячы моў свету (піджын, дурува, малінальтэпекская, тлапанэкская і інш.). Да ліку прычын даследчыкі адносяць як глабальныя (выцясненне адных моў іншымі), так і лакальныя (адсутнасць пераемнасці моўных традыцый у сем’ях).

Беларусь мае багатую культурную і духоўную спадчыну, якая фарміравалася на працягу стагоддзяў і перадавалася з пакалення ў пакаленне. У ходзе даследавання было ўстаноўлена, што беларуская мова знаходзіцца на першай ступені вымірання ва ўмовах імклівага змяншэння колькасці яе актыўных карыстальнікаў. Паколькі доля беларусаў, якія лічаць беларускую мову роднай, з кожным годам зніжаецца, важнасць набывае захаванне як самой мовы, так і культурных традыцый, этнаграфічных асаблівасцей, адметнасцей нацыі. Нацыянальная мова вызначае светапогляд, фарміруе нашу рэальнасць, уплывае на светаўспрыманне і інтэрпрэтацыю рэчаіснасці.

**Вывады**. У сучасным свеце важнай крыніцай камунікацыі людзей з’яўляюцца сродкі масавай інфармацыі, якія збліжаюць цэлыя этнасы у межах адной камунікатыўнай пляцоўкі. Мова, якую чалавек засвойвае ў працэсе свайго станаўлення асобаснага росту, у далейшым вызначае яго грамадскі патэнцыял, таму вельмі важна надаваць пільную ўвагу родным мовам, якія з’яўляюцца непаўторным адлюстраваннем самабытнасці і фактарам забеспячэння нацыянальнага адзінства народа.